УКАЗ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
16 кастрычніка 2018 г. № 411

## Аб афіцыйных геральдычных сімвалах

У мэтах захавання і развіцця традыцый беларускай дыпламатыі, павышэння прэстыжу дыпламатычнай службы пастанаўляю:

1. Заснаваць:

эмблему Міністэрства замежных спраў;

флаг Міністэрства замежных спраў;

нагрудны знак адрознення органаў дыпламатычнай службы;

нагрудны знак адзнакі органаў дыпламатычнай службы «За заслугі ў дыпламатычнай службе»;

нагрудны знак адзнакі органаў дыпламатычнай службы «Партнёрства»;

форменнае адзенне дыпламатычных работнікаў.

2. Зацвердзіць:

Палажэнне аб эмблеме Міністэрства замежных спраў, яе апісанне і выяву (прыкладаюцца);

Палажэнне аб флагу Міністэрства замежных спраў, яго апісанне і выяву (прыкладаюцца);

Палажэнне аб нагрудным знаку адрознення органаў дыпламатычнай службы, яго апісанне і выяву (прыкладаюцца);

Палажэнне аб нагрудным знаку адзнакі органаў дыпламатычнай службы «За заслугі ў дыпламатычнай службе», яго апісанне і выяву (прыкладаюцца);

Палажэнне аб нагрудным знаку адзнакі органаў дыпламатычнай службы «Партнёрства», яго апісанне і выяву (прыкладаюцца);

апісанне форменнага адзення дыпламатычных работнікаў (прыкладаецца).

3. Устанавіць, што права на нашэнне форменнага адзення маюць дыпламатычныя работнікі, якім прысвоены дыпламатычныя рангі Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла, Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасланніка першага класа, Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасланніка другога класа.

4. Подпункт 2.2.3.1 пункта 2 Указа Президента Республики Беларусь от 26 марта 1998 г. № 157 «О государственных праздниках, праздничных днях и памятных датах в Республике Беларусь» после абзаца четвертого дополнить абзацем следующего содержания:

«День дипломатического работника – 22 января;».

5. Міністэрству замежных спраў у трохмесячны тэрмін:

зацвердзіць правілы нашэння форменнага адзення дыпламатычных работнікаў;

прыняць іншыя меры па рэалізацыі дадзенага Указа.

6. Фінансаванне расходаў на выраб заснаваных дадзеным Указам афіцыйных геральдычных сімвалаў, акрамя форменнага адзення дыпламатычных работнікаў, ажыццяўляць у межах сродкаў, прадугледжаных у рэспубліканскім бюджэце на ўтрыманне органаў дыпламатычнай службы, і іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам.

Дыпламатычныя работнікі, якія маюць права на нашэнне форменнага адзення, аплачваюць яго кошт у памеры 100 працэнтаў з асабістых сродкаў.

7. Дадзены Указ уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь** **А.Лукашэнка**

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
16.10.2018 № 411

**ПАЛАЖЭННЕ**
**аб эмблеме Міністэрства замежных спраў**

1. Эмблема Міністэрства замежных спраў (далей – эмблема) з’яўляецца адметным знакам Міністэрства замежных спраў.

2. Выява эмблемы размяшчаецца на флагу Міністэрства замежных спраў і афіцыйным сайце ў глабальнай камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт, ганаровых граматах Міністэрства замежных спраў і падзяках Міністра замежных спраў.

3. Выява эмблемы можа выкарыстоўвацца на друкаванай, інфармацыйнай, сувенірнай, кіна-, відэа-, фота- і іншай прадукцыі, якая вырабляецца для патрэб Міністэрства замежных спраў, а таксама ў іншых выпадках, якія не супярэчаць заканадаўству.

4. Выява эмблемы можа размяшчацца ў службовых кабінетах Міністра замежных спраў, яго намеснікаў, кіраўнікоў структурных падраздзяленняў Міністэрства замежных спраў і іншых месцах, якія вызначаюцца Міністрам замежных спраў.

5. Дапускаецца ўзнаўленне выявы эмблемы ў каляровым, чорна-белым і аб’ёмным варыянтах.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
16.10.2018 № 411

**Апісанне эмблемы Міністэрства замежных спраў**

1. Эмблема Міністэрства замежных спраў уяўляе сабой выяву прамога роўнаканцовага клінчата-вырубнога крыжа з плоскасцямі чырвонага і справа ўнізе зялёнага колеру, які падзелены ўздоўж бакоў палоскамі белага колеру. Паміж слупоў і перакладзін крыжа размешчаны квадраты чырвонага колеру, па вонкавым краі крыжа – квадраты шэрага колеру.

2. Усе элементы крыжа абрамлены кантам белага колеру. Плоскасці чырвонага і зялёнага колеру дэкарываваны адпаведна праменямі цёмна-чырвонага і цёмна-зялёнага колеру, якія радыяльна разыходзяцца ад цэнтра. У цэнтры крыжа – круг чырвонага колеру з кантам і контурнай выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь белага колеру.

3. Крыж размешчаны на крузе сіняга колеру з аблямоўкай белага колеру, на якой размешчаны надпісы сіняга колеру: уверсе – «РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ», унізе – «МІНІСТЭРСТВА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ». Паміж надпісамі – кропкі сіняга колеру.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
16.10.2018 № 411

**Выява эмблемы Міністэрства замежных спраў (каляровая)**




ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
16.10.2018 № 411

**Выява эмблемы Міністэрства замежных спраў**
**(з перадачай колеру ўмоўнай шафіроўкай)**



ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
16.10.2018 № 411

**ПАЛАЖЭННЕ**
**аб флагу Міністэрства замежных спраў**

1. Флаг Міністэрства замежных спраў (далей – флаг) з'яўляецца яго афіцыйным геральдычным сімвалам.

2. Флаг можа размяшчацца на будынках Міністэрства замежных спраў, у службовых кабінетах Міністра замежных спраў, яго намеснікаў, кіраўнікоў структурных падраздзяленняў Міністэрства замежных спраў і іншых месцах, якія вызначаюцца Міністрам замежных спраў.

Пры адначасовым размяшчэнні Дзяржаўнага флага Рэспублікі Беларусь, флага Міністэрства замежных спраў і іншых флагаў іх размяшчэнне вызначаецца ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 5 ліпеня 2004 года «О государственных символах Республики Беларусь».

3. Выява флага можа выкарыстоўвацца на друкаванай, інфармацыйнай, сувенірнай, кіна-, відэа-, фота- і іншай прадукцыі, якая вырабляецца для патрэб Міністэрства замежных спраў, а таксама ў іншых выпадках, якія не супярэчаць заканадаўству.

4. Флаг можа выкарыстоўвацца падчас дзяржаўных свят і святочных дзён, урачыстых мерапрыемстваў, якія праводзяцца дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі, а таксама пры правядзенні культурных і спартыўных мерапрыемстваў.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
16.10.2018 № 411

**Апісанне флага Міністэрства замежных спраў**

Флаг Міністэрства замежных спраў уяўляе сабой прамавугольнае палотнішча цёмна-сіняга колеру з суадносінамі бакоў 1:2. У цэнтры вонкавага і адваротнага бакоў палотнішча размешчана эмблема Міністэрства замежных спраў дыяметрам 2/5 шырыні палотнішча.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
16.10.2018 № 411

**Выява флага Міністэрства замежных спраў (каляровая)**



ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
16.10.2018 № 411

**Выява флага Міністэрства замежных спраў**
**(з перадачай колеру ўмоўнай шафіроўкай)**




ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
16.10.2018 № 411

**ПАЛАЖЭННЕ**
**аб нагрудным знаку адрознення органаў дыпламатычнай службы**

1. Нагрудны знак адрознення органаў дыпламатычнай службы (далей – нагрудны знак) з’яўляецца знакам службовай прыналежнасці работнікаў да органаў дыпламатычнай службы і ўручаецца ім на перыяд выканання службовых абавязкаў.

2. Нагрудны знак мае тры віды:

для дыпламатычных работнікаў Міністэрства замежных спраў;

для дыпламатычных работнікаў, якія маюць дыпламатычны ранг Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла;

для дыпламатычных работнікаў, якія маюць дыпламатычныя рангі Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасланніка першага класа, Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасланніка другога класа.

3. Дыпламатычным работнікам, якія маюць дыпламатычныя рангі Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла, Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасланніка першага класа, Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасланніка другога класа, у тым ліку якім гэтыя дыпламатычныя рангі прысвоены да ўступлення ў сілу дадзенага Палажэння, нагрудны знак уручаецца ва ўрачыстай абстаноўцы Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь або па яго даручэнні Міністрам замежных спраў.

Дыпламатычным работнікам Міністэрства замежных спраў, якія паступілі на дыпламатычную службу да ўступлення ў сілу дадзенага Палажэння, нагрудны знак уручаецца Міністрам замежных спраў у вызначаныя ім тэрміны. Іншым катэгорыям дыпламатычных работнікаў Міністэрства замежных спраў нагрудны знак уручаецца пасля прынясення імі прысягі Міністрам замежных спраў або па яго даручэнні адным з яго намеснікаў.

4. Нагрудны знак носіцца на левым баку грудзей форменнага або цывільнага адзення.

5. Парадак выдачы, уліку і вяртання нагруднага знака вызначаецца Міністрам замежных спраў.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
16.10.2018 № 411

**Апісанне нагруднага знака адрознення органаў дыпламатычнай службы**

Нагрудны знак адрознення органаў дыпламатычнай службы для дыпламатычных работнікаў Міністэрства замежных спраў

1. Нагрудны знак адрознення органаў дыпламатычнай службы для дыпламатычных работнікаў Міністэрства замежных спраў (далей у мэтах дадзенага раздзела – нагрудны знак) уяўляе сабой выяву прамога роўнаканцовага клінчата-вырубнога крыжа з плоскасцямі чырвонага і справа ўнізе зялёнага колеру, які падзелены ўздоўж бакоў палоскамі серабрыстага колеру. Паміж слупоў і перакладзін крыжа размешчаны квадраты чырвонага колеру, па вонкавым краі крыжа – квадраты серабрыстага колеру.

2. Усе элементы крыжа абрамлены кантам серабрыстага колеру. Плоскасці чырвонага і зялёнага колеру дэкарыраваны адпаведна праменямі цёмна-чырвонага і цёмна-зялёнага колеру, якія радыяльна разыходзяцца ад цэнтра. У цэнтры крыжа – квадрат серабрыстага колеру, які пастаўлены на вугал і дэкарыраваны васьмю квадратамі серабрыстага колеру: па адным на кожнай з яго вяршынь і па два на верхніх старанах. На бакавыя і ніжні канцы крыжа накладзены галіны каралеўскай папараці серабрыстага колеру, паверх якіх размешчана дугападобная планка з надпісам «МЗС БЕЛАРУСІ» серабрыстага колеру.

Памеры нагруднага знака: вышыня – 45 мм, шырыня – 45 мм.

3. Адваротны бок нагруднага знака мае гладкую паверхню. На ім размешчаны надпіс «МІНІСТЭРСТВА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ» у пяць радкоў.

На адваротным баку нагруднага знака знаходзіцца шпілька для мацавання яго да адзення.

Нагрудны знак адрознення органаў дыпламатычнай службы
для дыпламатычных работнікаў, якія маюць дыпламатычны ранг
Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла

4. Нагрудны знак адрознення органаў дыпламатычнай службы для дыпламатычных работнікаў, якія маюць дыпламатычны ранг Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла (далей у мэтах дадзенага раздзела – нагрудны знак), уяўляе сабой выяву прамога роўнаканцовага клінчата-вырубнога крыжа з плоскасцямі чырвонага і справа ўнізе зялёнага колеру, які падзелены ўздоўж бакоў палоскамі залацістага колеру. Паміж слупоў і перакладзін крыжа размешчаны квадраты чырвонага колеру, па вонкавым краі крыжа – квадраты залацістага колеру.

5. Усе элементы крыжа абрамлены кантам залацістага колеру. Плоскасці чырвонага і зялёнага колеру дэкарыраваны адпаведна праменямі цёмна-чырвонага і цёмна-зялёнага колеру, якія радыяльна разыходзяцца ад цэнтра. У цэнтры крыжа – круг чырвонага колеру з кантам і контурнай выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь залацістага колеру.

Крыж размешчаны на галінах каралеўскай папараці залацістага колеру, па-за якімі – стужкі з беларускім арнаментам залацістага колеру.

Памеры нагруднага знака: вышыня – 35 мм, шырыня – 75 мм.

6. Адваротны бок нагруднага знака мае гладкую паверхню. На ім знаходзіцца шпілька для мацавання нагруднага знака да адзення.

Нагрудны знак адрознення органаў дыпламатычнай службы
для дыпламатычных работнікаў, якія маюць дыпламатычныя рангі
Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасланніка першага класа,
Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасланніка другога класа

7. Нагрудны знак адрознення органаў дыпламатычнай службы для дыпламатычных работнікаў, якія маюць дыпламатычныя рангі Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасланніка першага класа, Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасланніка другога класа (далей у мэтах дадзенага раздзела – нагрудны знак), уяўляе сабой выяву прамога роўнаканцовага клінчата-вырубнога крыжа з плоскасцямі чырвонага і справа ўнізе зялёнага колеру, які падзелены ўздоўж бакоў палоскамі серабрыстага колеру. Паміж слупоў і перакладзін крыжа размешчаны квадраты чырвонага колеру, па вонкавым краі крыжа – квадраты серабрыстага колеру.

8. Усе элементы крыжа абрамлены кантам серабрыстага колеру. Плоскасці чырвонага і зялёнага колеру дэкарыраваны адпаведна праменямі цёмна-чырвонага і цёмна-зялёнага колеру, якія радыяльна разыходзяцца ад цэнтра. У цэнтры крыжа – круг чырвонага колеру з кантам і контурнай выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь серабрыстага колеру.

Крыж размешчаны на галінах каралеўскай папараці серабрыстага колеру, па-за якімі – стужкі з беларускім арнаментам серабрыстага колеру.

Памеры нагруднага знака: вышыня – 35 мм, шырыня – 75 мм.

9. Адваротны бок нагруднага знака мае гладкую паверхню. На ім знаходзіцца шпілька для мацавання нагруднага знака да адзення.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
16.10.2018 № 411

**Выява нагруднага знака адрознення органаў дыпламатычнай службы (каляровая)**

Нагрудны знак адрознення органаў дыпламатычнай службы
для дыпламатычных работнікаў Міністэрства замежных спраў







Маштаб 1:1,5

Нагрудны знак адрознення органаў дыпламатычнай службы
для дыпламатычных работнікаў, якія маюць дыпламатычны ранг
Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла



Нагрудны знак адрознення органаў дыпламатычнай службы
для дыпламатычных работнікаў, якія маюць дыпламатычныя рангі
Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасланніка першага класа,
Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасланніка другога класа



ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
16.10.2018 № 411

**Выява нагруднага знака адрознення органаў дыпламатычнай службы (з перадачай колеру ўмоўнай шафіроўкай)**

Нагрудны знак адрознення органаў дыпламатычнай службы
для дыпламатычных работнікаў Міністэрства замежных спраў




Маштаб 1:1,5

Нагрудны знак адрознення органаў дыпламатычнай службы для дыпламатычных работнікаў, якія маюць дыпламатычны ранг Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла





Нагрудны знак адрознення органаў дыпламатычнай службы для дыпламатычных работнікаў, якія маюць дыпламатычныя рангі Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасланніка першага класа, Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасланніка другога класа





ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
16.10.2018 № 411

**ПАЛАЖЭННЕ**
**аб нагрудным знаку адзнакі органаў дыпламатычнай службы «За заслугі ў дыпламатычнай службе»**

1. Нагрудным знакам адзнакі органаў дыпламатычнай службы «За заслугі ў дыпламатычнай службе» (далей – нагрудны знак) узнагароджваюцца работнікі органаў дыпламатычнай службы за паспяховае выкананне пастаўленых перад гэтымі органамі задач па наступных пытаннях:

рэалізацыя знешнепалітычнага курсу Рэспублікі Беларусь;

умацаванне эканамічных сувязей Рэспублікі Беларусь з замежнымі дзяржавамі;

абарона законных правоў і інтарэсаў грамадзян і юрыдычных асоб Рэспублікі Беларусь;

выхаванне і падрыхтоўка спецыялістаў для дыпламатычнай службы.

2. Нагрудны знак мае дзве ступені. Вышэйшай ступенню нагруднага знака з'яўляецца I ступень. Узнагароджанне ажыццяўляецца паслядоўна нагрудным знакам II і I ступені згодна з загадам Міністра замежных спраў.

Нагрудным знакам I ступені ўзнагароджваюцца работнікі, якія маюць стаж працы на дыпламатычных пасадах не менш за 25 гадоў.

Нагрудным знакам II ступені ўзнагароджваюцца работнікі, якія маюць стаж працы на дыпламатычных пасадах не менш за 15 гадоў.

3. Парадак прадстаўлення да ўзнагароджання нагрудным знакам і ўзор пасведчання да яго вызначаюцца Міністрам замежных спраў.

4. Нагрудны знак і пасведчанне да яго ўручаюцца ва ўрачыстай абстаноўцы Міністрам замежных спраў або па яго даручэнні адным з яго намеснікаў, кіраўнікамі структурных падраздзяленняў Міністэрства замежных спраў, дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў Рэспублікі Беларусь.

5. Нагрудны знак носіцца на правым баку грудзей форменнага або цывільнага адзення і размяшчаецца пасля ордэнаў і медалёў, а пры адсутнасці такіх узнагарод – на іх месцы.

6. Асобы, узнагароджаныя нагрудным знакам, якія здзейснілі наўмыснае злачынства або дапусцілі грубую дысцыплінарную правіннасць, загадам Міністра замежных спраў могуць быць пазбаўлены нагруднага знака.

7. Запісы аб узнагароджанні нагрудным знакам і яго пазбаўленні заносяцца ў працоўную кніжку работніка.

8. Паўторнае ўзнагароджанне нагрудным знакам адной ступені не ажыццяўляецца. Дублікаты нагруднага знака і пасведчання да яго ўзамен згубленых не выдаюцца.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
16.10.2018 № 411

**Апісанне нагруднага знака адзнакі органаў дыпламатычнай службы «За заслугі ў дыпламатычнай службе»**

Нагрудны знак адзнакі «За заслугі ў дыпламатычнай службе» I ступені

1. Нагрудны знак адзнакі «За заслугі ў дыпламатычнай службе» I ступені (далей у мэтах дадзенага раздзела – нагрудны знак) уяўляе сабой выяву прамога роўнаканцовага клінчата-вырубнога крыжа з плоскасцямі чырвонага і справа ўнізе зялёнага колеру, які падзелены ўздоўж бакоў палоскамі залацістага колеру. Паміж слупоў і перакладзін крыжа размешчаны квадраты чырвонага колеру, па вонкавым краі крыжа – квадраты серабрыстага колеру.

2. Усе элементы крыжа абрамлены кантам залацістага колеру. Плоскасці чырвонага і зялёнага колеру дэкарыраваны адпаведна праменямі цёмна-чырвонага і цёмна-зялёнага колеру, якія радыяльна разыходзяцца ад цэнтра. У цэнтры крыжа – круг чырвонага колеру з кантам і контурнай выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь залацістага колеру.

Памеры нагруднага знака: вышыня – 45 мм, шырыня – 45 мм.

3. Адваротны бок нагруднага знака мае гладкую паверхню. На ім размешчаны надпіс «МІНІСТЭРСТВА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ» залацістага колеру ў пяць радкоў.

4. Нагрудны знак пры дапамозе вушка і кольца злучаецца з вертыкальнай прамавугольнай калодкай залацістага колеру, на якой размешчана стужка сіняга колеру з чырвонай паласой у цэнтры і чырвонай аблямоўкай па краях. У цэнтры чырвонай паласы – беларускі арнамент залацістага колеру.

На адваротным баку калодкі знаходзіцца шпілька для мацавання нагруднага знака да адзення.

Памеры калодкі: вышыня – 53 мм, шырыня – 34 мм.

Нагрудны знак адзнакі «За заслугі ў дыпламатычнай службе» II ступені

5. Нагрудны знак адзнакі «За заслугі ў дыпламатычнай службе» II ступені (далей у мэтах дадзенага раздзела – нагрудны знак) уяўляе сабой выяву прамога роўнаканцовага клінчата-вырубнога крыжа з плоскасцямі чырвонага і справа ўнізе зялёнага колеру, які падзелены ўздоўж бакоў палоскамі серабрыстага колеру. Паміж слупоў і перакладзін крыжа размешчаны квадраты чырвонага колеру, па вонкавым краі крыжа – квадраты серабрыстага колеру.

6. Усе элементы крыжа абрамлены кантам серабрыстага колеру. Плоскасці чырвонага і зялёнага колеру дэкарыраваны адпаведна праменямі цёмна-чырвонага і цёмна-зялёнага колеру, якія радыяльна разыходзяцца ад цэнтра. У цэнтры крыжа – круг

чырвонага колеру з кантам і контурнай выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь серабрыстага колеру.

Памеры нагруднага знака: вышыня – 45 мм, шырыня – 45 мм.

7. Адваротны бок нагруднага знака мае гладкую паверхню. На ім размешчаны надпіс «МІНІСТЭРСТВА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ» серабрыстага колеру ў пяць радкоў.

8. Нагрудны знак пры дапамозе вушка і кольца злучаецца з вертыкальнай прамавугольнай калодкай серабрыстага колеру, на якой размешчана стужка сіняга колеру з чырвонай паласой у цэнтры і чырвонай аблямоўкай па краях. У цэнтры чырвонай паласы – беларускі арнамент серабрыстага колеру.

На адваротным баку калодкі знаходзіцца шпілька для мацавання нагруднага знака да адзення.

Памеры калодкі: вышыня – 53 мм, шырыня – 34 мм.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
16.10.2018 № 411

**Выява нагруднага знака адзнакі органаў дыпламатычнай службы «За заслугі ў дыпламатычнай службе» (каляровая)**

Нагрудны знак адзнакі «За заслугі ў дыпламатычнай службе» І ступені



Нагрудны знак адзнакі «За заслугі ў дыпламатычнай службе» II ступені




ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
16.10.2018 № 411

**Выява нагруднага знака адзнакі органаў дыпламатычнай службы «За заслугі ў дыпламатычнай службе» (з перадачай колеру ўмоўнай шафіроўкай)**

Нагрудны знак адзнакі «За заслугі ў дыпламатычнай службе» I ступені



Нагрудны знак адзнакі «За заслугі ў дыпламатычнай службе» II ступені






ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
16.10.2018 № 411

**ПАЛАЖЭННЕ**
**аб нагрудным знаку адзнакі органаў дыпламатычнай службы «Партнёрства»**

1. Нагрудным знакам адзнакі органаў дыпламатычнай службы «Партнёрства» (далей – нагрудны знак) узнагароджваюцца асобы, у тым ліку замежных дзяржаў, якія не з’яўляюцца работнікамі органаў дыпламатычнай службы Рэспублікі Беларусь, за актыўнае садзейнічанне ў выкананні пастаўленых перад гэтымі органамі задач.

2. Парадак прадстаўлення да ўзнагароджання нагрудным знакам і ўзор пасведчання да яго вызначаюцца Міністрам замежных спраў.

Узнагароджанне нагрудным знакам ажыццяўляецца згодна з загадам Міністра замежных спраў.

3. Нагрудны знак і пасведчанне да яго ўручаюцца ва ўрачыстай абстаноўцы Міністрам замежных спраў або па яго даручэнні адным з яго намеснікаў, кіраўнікамі структурных падраздзяленняў Міністэрства замежных спраў, дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў Рэспублікі Беларусь.

4. Нагрудны знак носіцца на правым баку грудзей форменнага або цывільнага адзення пасля ордэнаў і медалёў, а пры адсутнасці такіх узнагарод – на іх месцы.

5. Асобы, узнагароджаныя нагрудным знакам, якія здзейснілі наўмыснае злачынства або дапусцілі грубую дысцыплінарную правіннасць, загадам Міністра замежных спраў могуць быць пазбаўлены нагруднага знака.

6. Паўторнае ўзнагароджанне нагрудным знакам не ажыццяўляецца. Дублікаты нагруднага знака і пасведчання да яго ўзамен згубленых не выдаюцца.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
16.10.2018 № 411

**Апісанне нагруднага знака адзнакі органаў дыпламатычнай службы «Партнёрства»**

1. Нагрудны знак адзнакі органаў дыпламатычнай службы «Партнёрства» (далей – нагрудны знак) уяўляе сабой выяву прамога роўнаканцовага клінчата-вырубнога крыжа з плоскасцямі чырвонага і справа ўнізе зялёнага колеру, які падзелены ўздоўж бакоў палоскамі залацістага колеру. Паміж слупоў і перакладзін крыжа размешчаны квадраты чырвонага колеру, па вонкавым краі крыжа – квадраты серабрыстага колеру.

2. Усе элементы крыжа абрамлены кантам залацістага колеру. Плоскасці чырвонага і зялёнага колеру дэкарыраваны адпаведна праменямі цёмна-чырвонага і цёмна-зялёнага колеру, якія радыяльна разыходзяцца ад цэнтра. У цэнтры крыжа – круг чырвонага колеру з кантам і контурнай выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь залацістага колеру. Крыж размешчаны на чатырохпрамянёвай зорцы залацістага колеру.

Памеры нагруднага знака: вышыня – 45 мм, шырыня – 45 мм.

3. Адваротны бок нагруднага знака мае гладкую паверхню. На ім размешчаны надпіс «МІНІСТЭРСТВА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ» залацістага колеру ў пяць радкоў.

На адваротным баку нагруднага знака знаходзіцца шпілька для мацавання яго да адзення.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
16.10.2018 № 411

**Выява нагруднага знака адзнакі органаў дыпламатычнай службы «Партнёрства» (каляровая)**




Маштаб 1:1,5

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
16.10.2018 № 411

**Выява нагруднага знака адзнакі органаў дыпламатычнай службы «Партнёрства» (з перадачай колеру ўмоўнай шафіроўкай)**




Маштаб 1:1,5

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
16.10.2018 № 411

**Апісанне форменнага адзення дыпламатычных работнікаў**

Касцюм

1. Мужчынскі касцюм складаецца з пінжака, камізэлькі і штаноў, якія выраблены з ваўнянай касцюмнай тканіны цёмна-сіняга колеру.

2. На пінжаку размешчаны бакавыя ўразныя прамыя кішэні з клапанамі, тры гузікі з выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, шыццё* на каўняры, лацканах і абшлагу рукавоў.

3. Штаны прамога сілуэта.

4. Жаночы касцюм складаецца з жакета і спадніцы, якія выраблены з ваўнянай касцюмнай тканіны цёмна-сіняга колеру.

5. На жакеце размешчаны бакавыя ўразныя прамыя кішэні з клапанамі, тры гузікі з выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, шыццё* на каўняры, лацканах і абшлагу рукавоў.

6. Спадніца прамога сілуэта.

---

* Для дыпламатычных работнікаў, якім прысвоены дыпламатычны ранг Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла, – гузікі і шыццё залацістага колеру, для дыпламатычных работнікаў, якім прысвоены дыпламатычныя рангі Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасланніка першага класа, Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасланніка другога класа, – гузікі і шыццё серабрыстага колеру.

Кашуля, блуза

7. Кашуля мужчынская і блуза жаночая белага колеру з доўгімі рукавамі.

Гальштук, гальштук-бант

8. Гальштук мужчынскі і гальштук-бант жаночы цёмна-вішнёвага або чорнага колеру.

9. Гальштук (гальштук-бант) прымацоўваецца да кашулі (блузы) закрэпкай залацістага або серабрыстага колеру.